**Н.М. Борсук** (Брэст, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт)

## "ГОРАД ПОЎНЫ РАЗНАГУКУ": БРЭСТ У ПАЭТЫЧНЫМ УСПРЫМАННІ НАДЗЕІ ПАРЧУК

Ва ўсім свеце не знойдзецца, бадай, ніводнага паэта, які за сваё творчае жыццё ні разу не паспрабаваў бы стварыць песню-ўшанаванне роднаму гораду. Не выключэнне і Надзея Парчук. Народжаная на Палессі, у вёсачцы з прыгожай назваю Ладараж, вось ужо амаль дваццаць гадоў жыве Надзея Мікалаеўна ў Берасці. Спагадлівая да людзей, паэтэса адбірае "залацінaчкі-словы" для сваіх паэтычных радкоў пра "куточак святы": "*Калі спяваць, дык толькі так спяваць, / Каб дождж і вецер аціштлі разам, / І песні ўсе радзіме прысвячаць, / Сваёй зямельцы – вечнай па-над часам*" (верш "Калі ўжо жыць, дык толькі гэтак жыць").

Асабліва любіць назіраць Н. Парчук за родным горадам вясной, калі "сонца пяшчотнае ў Брэсце", калі "шэрасць апала з нябёс", а дрэвы "мільёнамі вочак глядзяць на сусвет з цеплынёй" (верш "Сплыла аблачыннасць нарэшце"). З узростам паэтка навучылася даражыць кожнай парой года, але найбольш любіць вясну: "*Ніяк не ўпісваюся ў зімку. / Цвіце ў душы маёй вясна, / І май спявае салаўямі*" (верш "Напрадвесні"). Калі для лірычнай гераіні Н. Парчук зімовы дзень асацыіруецца з няшчырасцю, няспраўджанымі марамі, адчуваннем адзіноты, то вясновы – перш-наперш з сонейкам, залатым, зіхоткім, шчырым да слёз, шчодрым,

пяшчотным, родным, якое “жыццё бласлаўляе”. Адсюль назвы вершаў “Свяціся, сонца яснае!..”, “Паважанае сонца”, “Пад сонцам спрадвечным”, “Свяцістага сонца жадаю” і інш. Эпітэты, што адбірае паэтка – “зімовы дзень, такі ўжо слёзны”, “вясна сакавітая”, “вясна… аддана-ўлюбёная / ў дубровы і ў палі” – надаюць вершам адпаведна элегічны і жыццесцвярджальны настрой.

Вышэйвыказаная думка арганічна спалучана ў замкавых радках трыялета “Ад весняй пекнаты / пагляду не адвесці”. Форма верша дазваляе некрыклівa і неназойліва перадаць душэўны стан гераіні напрадвесні, развівае ўменне паэткі сцісла, але глыбока выражаць свае думкі, перажыванні, якія захаваны ў падтэксце твора. Паўторы, у сваю чаргу, напаўняюць думку-пачуццё рознымі адценнямі медытатыўнасці, якая знаходзіцца ў пастаянным напружаным развіцці. Праз асэнсаванне ланцужка вобразаў – першы пробліск вясновы – першы промень – сонца – чытач паступова прыходзіць да ўсведамлення жыццёвай пазіцыі паэтэсы, па перакананні якой “сонца – дар нябёсаў”.

Нельга не заўважыць, што вобраз сонейка – скразны на старонках паэтычных зборнікаў Н. Парчук. Толькі на старонках паэтычнай кнігі “Раскрыліўся бусел над хатай” ён сустракаецца 39 разоў. І невыпадкова “Гімн Брэста” пачынаецца з паэтычнага вобраза “вечнага свяціла”. Гэтым самым паэтэса падкрэслівае, што жыццядайны дух сонца ахоўвае ўжо некалькі стагоддзяў прыгожы, свабодны, родны горад над Бугам-ракою. Н. Парчук імкнецца, падобна сонейку, запаліць у душы сілаю малітвы “святло ў душах” берасцейцаў: “*О Божа мілы, навучы / Любіць людзей, як Ты іх любіш! / І падкажы, дзе сілы ўзяць, / Каб не займець шыпоў, бы ў ружах?*” І гэта не проста словы.

Воляй Божай наканавана была сустрэча Н. Парчук з В. Бакун, А. Божулем і інш. – невідушчымі людзьмі, якія вымушаны былі заняцца творчасцю, каб выжыць. У свой час лёс таксама паставіў Н. Парчук на творчую сцежку, а Бог надзяліў яе чуйнай душой, відушчым сэрцам, падтрымкаю чулых і спагадлівых людзей – М. Сянкевіча, А. Каско, М. Пракаповіча, У. Бензярука… .

Невыпадкова прадмову да паэтычнага зборніка “Ладараж” М. Пракаповіч назваў “Асуджаная на паэзію”: “*Асуджаная лёсам на існаванне – без старонняй дапамогі – у звужаным да чатырох сценаў свеце, яна жыве інакшым, больш тонкім і складаным, чым мы, асуджаныя на няспынны рух, мурашкі-чалавечкі*” [4, с. 3]:

Белакрылыя сцягі –
Крылы за плячыма:
Не ўзлячу дзянёк-другі,
Трэці – немагчыма.

Мне без вас ужо – ніяк,
Хоць і локці ў дзірах,
Ці ліхі, ці добры знак,
Ды не выбар – вырак.

Паэтычны талент патрабуе пастаяннай інтэлектуальнай падтрымкі. З верша-прысвячэння Івану Арабейку "У чаканні" бачна, што ў яго паэтэса вучыцца глядзець на прыроду, як на "Божае стварэнне", "сілкавацца ў нябёсах".

Яна ўдзячна пісьменніку-ветэрану, празаіку Сяргею Цыплюку, паэту Сяргею Амяльчуку, інжынеру завода "Брэстгазаапарат", за прапаганду беларускай, у прыватнасці берасцейскай, кнігі. Думаецца, вызначэнне "паэты-гандляры" не перадае сутнасць рамяства, якім займаюцца брэсцкія мастакі слова. Сваю задачу яны бачаць у тым, каб "*распальваць творчасці касцёр. / Каб кожны з нас любой парою / Каля іскрыстага кастра / Мог саграваіца дабрынёю / І спасцігаць закон дабра*" (верш "Празаіку"). У паэтычных радках, прысвечаных Сяргею Цыплюку, выразна выяўлена грамадзянская пазіцыя творцы: кнігі трэба не толькі пісаць, з імі неабходна ісці да чытача, якому будзе прыемна не толькі набыць выданне, але і атрымаць *аўтограф, пачуць адказ на хвалюючыя пытанні.*

Па перакананні Н. Парчук, не перавяліся на зямлі берасцейскай таленавітыя, міласэрныя дабрадзеі, да ліку якіх па праву паэтэса адносіць М. Сянкевіча, які з увагаю і цікавасцю сочыць за выступленнямі Н. Парчук у друку, звяртае ўвагу чытача на стыль паэтэсы: "…з гадамі больш важкім зрабіўся сказ Надзеі Парчук, узмацнілася яе ўвага да паэтычнага радка. Надзея настойліва імкнецца падпарадкаваць сабе паэтычнае слова, стварыць запамінальны малюнак" [5, с. 3]. У прадмове "Подых ветру ў расчыненым акне" да зборніка "Раскрыліўся бусел над хатай" літаратуразнаўца, паэт, празаік М. Сянкевіч адзначае: "У вершах апошняга часу Надзея імкнецца адысці ад "глабальных тэм", утаймоўвае жаданне адным разам і назаўжды вырашыць за чалавека ўсе праблемы, што назбіраліся за яго гісторыю" [5, с. 4]. Як тут не пагадзіцца з Міколам Іванавічам, што "паэзія Н. Парчук – гэта паэзія для душы, таму абавязкова стане для некага паратункам у гэтым не заўсёды ласкавым свеце" [5, с. 4]: "*Паэзія – жывая прыгажосць / Тых адухоўленых пачуццяў, / Што пасылаюцца з нябёс, / Каб да зямнога дакрануцца*" (верш "Храм паэзіі").

Надзея Парчук штодзённа пачувае сябе часцінкай літаратурнага асяроддзя. Яна стала сябрам, дарадчыцай для многіх паэтаў. Надзея Мікалаеўна верыць у дапамогу Усявышняга, Айца Святога, Суддзі, Стваральніка, Творцы. Як бачна, да Бога жанчына-творца звяртаецца з асаблівай пашанай і хваляваннем. Адсюль вялікая літара ў напісанні вышэйпазначаных слоў: "*Ад шчасця ў Госпада ключы – / не ў лёсу кволага*" (верш "Сутоцце белых аблачын", прысвечаны Андрэю Божулю). Паэтэса верыць "у духоўна-творчы плён" В. Бакун, А. Божуля, таму і знаходзіць адметныя словы-падтрымкі ў адрас пачаткоўцаў: "*Пальчыкамі-вочкамі / ты глядзіш на свет, / мілы мой, найшчыры мой, / слаўны мой паэт!*"

(верш "Добры след", прысвечаны В. Бакун). Сваёй сяброўцы Ніне Паповай Надзея Мікалаеўна раіць апяваць родны край па-руску: "*А мова маці – родная твая – / даўно чакае спеваў беларускіх*" (верш "На дарогу"). Яна з захапленнем выказваецца пра Аляксея Капацкевіча, які ў семнаццацігадовым узросце страціў зрок, але здолеў перадаць на старонках сваіх паэтычных зборнікаў багаты дыяпазон думак, перажыванняў, пачуццяў: "*умудрыўся напісаць / Пра водар сонца светлага*", "*пра блакіт над гонямі*", "*пра кветку ў небе з промнямі*"; *праспяваць* "*пра дождж ык па-над плёсамі, / Як сонны ветах спачываў / Між маладымі соснамі*".

Н. Парчук любіць, калі Брэст напаўняецца розгаласам званоў: "*звон разносіцца наўкола, / узнімаецца да высяў, / і душы кранутай голас / просіць сэрца: памаліся!*" Далучыўшыся да Божай красы, гераіня са словамі малітвы аб дараванні літасці роднай Бацькаўшчыне, духоўным вызваленні людзей ад злых задум і ўчынкаў звяртаецца да "небных высяў", "прамяністых зорачак". Амаль у кожным вершы, прысвечаным Брэсту, мы бачым неба – начное, вячэрняе, зорнае…

Ясныя зоркі бласлаўляюць напісаныя Н. Парчук паэтычныя радкі (верш "Начныя гукі"), "спрадвечнай блізкасцю да Бога, сваім святлом, сваёю чысцінёй" зоры, спадзяецца творца, дапамогуць берасцейцам вырашыць сацыяльныя праблемы свайго часу – "разблакіцяць лёс" (верш "Крыніца натхнення"). Перад тварам неба, сонца, зораў вырашаецца лёс чалавека – "*Сузор'е ў небе дзесь тваё / гарыць і спеліцца… / Мне ў твой духоўна-творчы плён / Узнёсла верыцца*" (верш "Сутоцце белых аблачын"). Калі вобраз сонца нараджаецца ў паэзіі Н. Парчук пад уплывам Я. Купалы, то вобраз зор – пад уплывам М. Багдановіча, "госця з высокага неба", як называў беларускага паэта У. Ігнатоўскі: "*Я зноў, чытаючы "Вянок", / Тваёй душою створаны, / П'ю за глытком жывы глыток – / Асвечаны, азораны*" (верш "Жывы глыток"). У паэтычных радках верша "Я слова моўлю аб газеце" да 55-годдзя з дня выхаду першага нумара газеты "Заря над Бугом" Н. Парчук сцвярджае гарманічнае суіснаванне зямной і нябеснай красы: "*Зара ўзышла ды так прыгожа / зазззяла палкаю душой*". "Касмічны пейзаж" Н. Парчук – гэта не проста эстэтычная карціна красы. Яна мае філасофскі сэнс. Гэтымі радкамі паэтэса падкрэслівае, што газета з такою паэтычнаю назваю "Заря над Бугом" кранае сэрцы берасцейцаў "жывым даходлівым радком", заводзіць з імі "размову ціхую". Газета неаднойчы расказвала і аб надзіва стойкай, моцнай духам і таленавітай жанчыне з няпростым лёсам – Надзеі Парчук, друкавала яе вершы.

З асаблівым хваляваннем лірычная гераіня Н. Парчук успрымае царкоўны звон на Мядовы Спас. У гэты час у сялян жніво, самы адказны перыяд сельскагаспадарчых работ на полі. Для паэтэсы, вясковай

дзяўчыны, добра вядома праца хлебароба, пах свежага хлеба. Традыцыйным сталі для яе вобразы каласкоў, зярнятак, жніва, сяўбы ("творчая сяўба" – верш "Не крыўдуй!..", "хлеб – душы Гасподняй твор, / Плод зямлі і сініх высяў" – верш "Дар нябёсаў"), якія актывізаваны на старонках зборнікаў у выглядзе параўнанняў: "*Нібы сцяблiначкi – радкi, / а слоўкі – то зярняты, / а строфы – гэта каласкі, / а верш – то сноп багаты*" (верш "Міколу Пракаповічу"); "*Сейбіт я векавечнага слова. / Чысты аркуш ёсць поле маё*" (верш "Я – вясковая"). Літаратурнае аб'яднанне – Саюз пісьменнікаў Беларусі, сябрам якога з'яўляецца і Надзея Парчук, уяўляецца паэтэсе "спеўнаю нівай" (верш "Дабрадзей"). Паэтэса дбае, каб на зямлі беларускай нараджаліся моцныя, здаровыя каласкі. Таму ў звароце да Усявышняга просіць грахі яе лірычнай гераіні прасеяць праз праведнае сіта і спапяліць, "*каб болей не ўзышлі – / ні пры дарозе, ні крый Божа, у полі: / я не хачу на роднае зямлі / нікчэмным зеллем прарастаць ніколі*" (верш "Малітва").

Важная роля па яднанні "небных далей", "сэрцаў людскіх", абуджэнні лясоў і палёў належыць, на думку Н. Парчук, званару. Ён прадстае перад чытачом сувязным паміж небам і зямлёй – светам людзей і іншасветам: "*Спыніся, прахожы, паслухай, / Як неба гаворыць з табой – / Мелодыяй чыстага гука / І ласкай Гасподняй святой*" (верш "Званар"). Сапраўды, музыка звону валодае цудадзейнай сілаю. Яна абуджае не толькі душы людзей, але і так званую памяць месца, бо, як вядома, чалавечыя пачуцці падчас страшнай трагедыі не знікаюць бясследна. Імі насычаны вершы Н. Парчук "Ода Брэсту", "Гімн Брэсту", верш "Цвіце пераможна вясна".

Дзеясловы загаднага ладу, звароткі, клічныя сказы, выкарыстаныя паэтэсаю, безумоўна, надаюць вершу пафаснасць, урачыста-ўзнёслы настрой: "*Квітней, красуйся, Брэст любімы, / між беларускіх гарадоў!"; "Ты гонар нашае радзімы – / яе дачок, яе сыноў!"; "стаіш ты, Брэст родны, – прыгожы, свабодны / і будзеш стаяць у вяках!*" (і інш.), ўзмацняюць думку аб неўміручасці подзвігу абаронцаў Брэсцкай крэпасці, які "жыве і жыць будзе … на сотні вякоў": "*Над Бугам-ракою / бяссмерце героі / і славу табе здабывалі, / каб ты красаваўся, / з бядою не знаўся / на вольнай і роднай зямлі*" ("Ода Брэсту").

Берасцейская зямля прадстае перад чытачом як жывая, адухоўленая істота, дзякуючы вершам-прысвячэнням, у якіх узгадваюцца лёсы людзей, звязаных з родным краем. "Дзіця вайны" – гэта Марыя Тарасаўна Каржова. Марыі Тарасаўне, дзякуй Богу, пашчасціла пераадолець нечалавечыя пакуты, прайсці праз ваенныя выпрабаванні ў якасці радысткі. Нягледзячы на цяжкае раненне, дзяўчына-падлетак выканала баявое заданне, за што атрымала падзяку ад Варашылава. Празаічная кніга Марыі Каржовай

“Ад Брэста да Уладзівастока”, якая засталася пасля яе смерці, – гэта напамін нашчадкам, што пяшчотнае слова дзяўчына, “дзяўчына-красуня” і страшнае слова “вайна” не маюць нічога агульнага (верш “Дзіця вайны”). Берасцейская зямля помніць, праз якія выпрабаванні, беды прайшлі былыя вязні фашысцкіх засценкаў: “*Былі Вы ў пашчах ваўкадаваў, / у чорнай смерці пад крылом, / цярпелі голад і зняславу / і выжывалі ім назло!*” (верш “Былому вязню фашысцкіх засценкаў – М.М. Пігараву прысвячаецца”).

Згодна міфам, наша зямля трымаецца на трох кітах. Для беларускай паэтэсы такімі кітамі з’яўляюцца вера, любоў, матчына мова (верш “Тры кіты”). Менавіта яны дапамагалі нашым продкам не скарыцца ў самыя складаныя для краіны часы, а сёння, быццам жывыя ліхтарыкі, спрыяюць нашаму сучасніку годна крочыць праз будні-падзеі: “*З небных сплаваў скаваў / Бог плыты і паслаў / нам у дар, як святыя асновы, – / кожны з нас каб спазнаў, / ім пашану аддаў – / мове матчынай, / веры, / любові*”.

Н. Парчук узгадвае ў вершы “Братэрская сустрэча” светлыя часы з мудрай, прыгожай гісторыі беларускага народа, калі нашы продкі жылі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Светлыя, таму што наша дзяржава была адной з найбуйнейшых краін у Еўропе, законы дазвалялі людзям вандраваць, вучыцца ў замежных універсітэтах, карыстацца беларускаю моваю ў якасці дзяржаўнай… Успамін аб былой велічы краю выклікае адначасова і сум, бо “*злы лёс вераломна народ раздзяліў, / Бяздумна акрэсліў граніцы, / Каб сілы раздроблены нашы былі – / Раскроена жорстка зямліца*”. Для паэткі важна, каб яе чытачы не раслі бязроднымі паслугачамі, а жылі ў згодзе, ведалі гісторыю краю, свой радавод, як некалі іх дзяды ведалі яго да сёмага калена.

На старонках паэтычных зборнікаў Н. Парчук з удзячнасцю ўспамінае матулю, землякоў, якія дапамаглі ёй адчуць стылістычную розніцу паміж словамі “кахаю” і “люблю”, “дзявочыя вёсны” і “женский зенит”, “зязюля” і “кукушка”, “утро” і “ранак”, “стрываю” і “стерплю”, “блакітнае неба” і “небо с синевой”… “Апантанымі сейбітамі” на ніве беларускасці для паэтэсы сталі М. Сянкевіч, Н. Мацяш, З. Дудзюк, Р. Бензярук, І. Арабейка і многія іншыя. “Трохперсце” паэтаў – М. Рудкоўскага, М. Пракаповіча, А. Каско – атаясамліваецца для Надзеі Мікалаеўны з чыстай крынічкай, побач з якой можна духоўна наталіцца, “каб … натхніцца, / падбадзёрыць свой дух”. Таму і ўводзіць Н. Парчук у кнігу “Раскрыліўся бусел над хатай” раздзел “Постаці зямлі беларускай” (вершы “Прадслава”, “Рагнеда”, “Еўфрасіння Полацкая” і інш.): “*Заўсёды ў найцяжэйшыя часы / у свет прыходзяць постаці такія, / з якіх нашчадкі пішуць абразы / і берагуць рэліквіі святыя*”.

Вось ужо на працягу не аднаго стагоддзя ідуць берасцейцы за "існай дапамогай" да Святога Афанасія Брэсцкага: "*...Да мошчаў, нібы да ракі, / да вод жывых у Іардане – / нясём і боль мы, і грахі, / каб атрымаць выратаванне*". Для лірычнай гераіні Н. Парчук гэтая постаць – узор стойкасці, прыклад служэння "Хрыстовай веры", людзям ("ён. Афанасій, у вяках / святой нятленнасцю нам свеціць"), самаахвярнасці. Чытаем радкі з верша "Святому Афанасію Брэсцкаму", і мімаволі ўзгадваецца гістарычны факт, калі вялі Афанасія Філіповіча на расстрэл, ён не адмовіўся ад сваіх поглядаў: – Што я прамаўляў, ад таго не адракуся. З тым і смерць прыму… Святы для Н. Парчук стаў майстрам мастацкага слова, чалавекам рэдкага пісьменніцкага таленту, выдатным мысліцелем і публіцыстам, адукаваным чалавекам, які ведаў багаслоўскую і гістарычную літаратуру, валодаў польскай, лацінскай, грэчаскай, славянскай мовамі. "*Яго душа, як і ў быццё, / стаіць прад Богам на каленях / ды просіць з палкім пачуццём / дабра наступным пакаленням*". У словах малітвы, якую прамаўляе прападобнамучанік Афанасій Брэсцкі, мы чуем словы малітвы да цудатворнага вобраза Прачыстай Багародзіцы. Магчыма таму, што Купяціцкі абраз Маці Божай суправаджаў Святога ўсё жыццё, аб гэтым Афанасій Філіповіч узгадвае ў "Дыярыушы". Так апісвае Афанасій Брэсцкі з'яўленне Багародзіцы перад падарожжам у Маскву: "*Потым, перад выпраўленнем у дарогу, перахрысціліся з братамі, увайшлі ў прытвор царкоўны і, даверыўшыся ва ўсім волі Божай, адбілі некалькі паклонаў. Потым зірнулі праз акенца на цудатворны вобраз Прачыстай Багародзіцы. Раптам здарыўся шум дужа страшны ў царкве. Спалоханы, я хацеў быў хутка ўцячы, але потым асмеліўся, паўторна глянуў у акенца, прамаўляючы: – О, Прачыстая Багародзіца, будзь са мною! І на тое пачуў пранікнёны голас: – Іду і Я з табою*!" [6].

Божага даравання просіць Н. Парчук для людзей, якія шчыруюць у родным Берасці. "Рыфму з добрых шчырых словаў" знаходзіць паэтэса для рэдакцыйнай калегіі часопіса "Акно", Валюшка Людмілы Антонаўны, загадчыцы спецыялізаванай бібліятэкі. Гэтая жанчына стала падтрымкаю для творцаў Брэсцкай абласной арганізацыі Беларускага таварыства інвалідаў па зроку. Яна выразна ўсведамляе, што неардынарнай творчай асобе, чалавеку, які носіць у сэрцы іскрынку, патрэбна падтрымка. У вершы "Бібліятэкар" паэтэса выказвае словы ўдзячнасці Людміле Антонаўне, бо з паяўленнем гэтай узнёслай, адданай любімай справе жанчыны творчае жыццё забурліла: "*Яна табе часопіс, кнігу / Сама дахаты прынясе, / ... / Яе ж у Брэсце кожны знае / І па-прыяцельску здалёк – / Не пройдзе міма – прывітае / У хмурны й сонечны дзянёк*". Думаецца, менавіта пасля знаёмства з Л.А. Валюшка думка, якая вярэдзіла душу паэтэсы, вылілася на паперу ў форме арыгінальнага афарыстычнага

выслоўя: “*Бібліятэкар – гэта пасрэднік паміж творцамі і чытачамі, як святар паміж Богам і людзьмі*”. З гонарам узгадвае Н. Парчук “знакамітасць песеннага Брэста” Сяргея Любчука. На яго музычным рахунку больш за дзесяць аркестраў, якімі Сяргей Фёдаравіч кіраваў, пачынаючы з калектыву Брэсцкага дома піянераў, і вось ужо на працягу больш чым дваццаці гадоў творчы лёс яго паяднаны з вядомым мастацкім калектывам “Бярэсце” пры Палацы культуры прафсаюзаў. Сяргей Фёдаравіч актыўна займаецца педагагічнай дзейнасцю, піша песні, у тым ліку і аб родным горадзе, “дзівінскіх гонях”, адкуль родам, мае паэтычны вопыт. Гэта і дае права Н. Парчук у вершы-прысвячэнні “Маэстра” выказаць захапленне творчым і жыццёвым лёсам гэтага таленавітага чалавека: “*Такому лёсу – толькі пазайздросціць, / Такую долю – толькі й шанаваць, / Каб праз жыццё нястомна з маладосцю / І з песняй шчырай цесна сябраваць*”. Паэтэса перакананa: “старасць не дагоніць” героя яе верша, “пакуль душа і сэрцайка пяе”.

Як бачна, Надзея Парчук – паэтка з вострым унутраным слыхам і зрокам. Яна ўслухоўваецца ў рытм начнога горада, каб адчуць, заўважыць, што трывожыць чалавека ў свеце: “*Хто сказаў, што горад спіць? / Горад поўны разнагуку*” (верш “Начныя гукі”). Мы, бясспрэчна, давяраем паэтэсе. Чалавек, які здольны пачуць, як “вецер залатошыць крыллем шаты”, заўважыць, як “ранaчак босы разаслаў абярог”, прывітацца з жамчужынкамі-дажджынкамі, сонцам вясновым, усміхнуцца веснавому дню (“Добрай раніцы, сонца вясновае!”, “Добры дзень, прыгажосць!”, “Вітай мяне, вясновы дзень, / Я адкажу табе – усмешкай”), прыручыць лёгкакрылага Пегаса “да працы цяжкой”, шчырым словам адсланіць чалавечыя душы ад абыякавасці, няшчырасці, духоўнай глухаты: “*Не папракай сляпога ягонымі сінякамі, глухога – раўнадушшам, бязногага – гультайствам, маладога – нявопытнасцю, старога – нямогласцю. І калі ты ні ў чым ім не можаш дапамагчы, то падзякуй хоць Богу, што ты – не адзін з іх*”.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Парчук, Н. Раскрыліўся бусел над хатай : вершы, афарызмы, пераклады / Н. Парчук. – Брэст : Альтернатива, 2009. – 152 с.
2. Парчук, Н. Берагі надзеі : зб. паэзіі / Н. Парчук. – Брэст : Альтернатива, 2014. – 160 с.
3. Парчук, Н. Ладараж : вершы / Н. Парчук. – Брэст : Брэсц. друк., 2016. – 104 с.
4. Пракаповіч, М. Асуджаная на Паэзію / М. Пракаповіч // Ладараж / Н. Парчук. – Брэст, 2006. – С. 3–5.
5. Сянкевіч, М. Подых ветру ў расчыненым акне / М. Сянкевіч // Раскрыліўся бусел над хатай : вершы, афарызмы, пераклады / Н. Парчук. – Брэст, 2009. – С. 3–6.

6. Філіповіч, А. Дыярыуш / А. Філіповіч // Хрэстаматыя па старажытнай беларускай літаратуры / склад. А. Ф. Каршунаў. – Мінск, 1951. – 471 с.